*Л.П.СІВУРАВА*

# ФЕСТЫВАЛЬНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ГАЛІНЕ НАРОДНАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ НА МЯЖЫ XX–XXI стст.

Святочная культура – неад’емная частка жыцця грамадства. Яна цесна звязана з яго сацыяльнай структурай, узроўнем развіцця вытворчых сіл, пануючай у грамадстве ідэалогіяй. Змест і формы святочнай дзейнасці дэтэрмінаваны этнакультурнымі традыцыямі, сацыяльна-палітычнымі, эканамічнымі і іншымі фактарамі.

Дзевяностыя гады мінулага стагоддзя сталі пераломным этапам не толькі ў эканамічным, палітычным, але і культурным развіцці нашай краіны. Тут, як і ў іншых сферах, адбываецца паступовы пераход да прынцыпаў дэмакратыі, кардынальна мяняюцца грамадскія ідэалы. Характэрнай асаблівасцю новага этапу развіцця беларускага грамадства з сярэдзіны 90-х гг. XX ст. сталі змены культуралагічнага парадку, якія выявіліся ў дынаміцы формаў сацыяльна – культурнай актыўнасці. Рух народнай творчасці як з’ява найбольш масавая адлюстроўвае эвалюцыю грамадскай свядомасці ў напрамку яе мнагамернасці, выяўляе ў ёй працэсы паглыблення і пашырэння нацыянальна-культурных інтарэсаў.

Гэтаму спрыяюць дэпалітызацыя культурнага жыцця беларускага народа, вызваленне творчай ініцыятывы насельніцтва. У адрозненне ад савецкай сістэмы арганізацыі грамадска-культурнага жыцця цяпер відавочнай стала рознанакіраванасць вектараў сацыяльна-культурнай ініцыятывы. Наяўнасць у ёй адначасова цэнтрабежных і цэнтраімклівых тэндэнцый прывяла, па-першае, да змяшчэння цэнтра ўвагі ў бок рэгіёнаў, а па-другое, да множнасці культурных інтарэсаў і варыятыўнасці формаў іх праяўлення, якія грунтуюцца на аб’яднанні намаганняў творчых асоб і ўладавых структур пры грамадскай падтрымцы творчай ініцыятывы.

У гэты час намеціўся працэс абнаўлення фестывальнай дзейнасці. Са зменай палітыка-ідэалагічных пастулатаў беларускай дзяржаўнасці адбылося пашырэнне культурных межаў, актывізавалася культурнае ўзаемадзеянне з краінамі Заходняй Еўропы, сталі магчымымі правядзенне міжнародных фестывальных мерапрыемстваў з удзелам прадстаўнікоў іншых краін і выезд беларускіх калектываў на міжнародныя імпрэзы.

Характэрнай для Беларусі асаблівасцю стала перамяшчэнне акцэнтаў фестывальнай актыўнасці з цэнтра на перыферыю. Многія рэспубліканскія фестывальныя праекты “прыжыліся” ў раённых гарадах. Большасць фестываляў народнай творчасці ўзніклі там, дзе было гістарычна сфарміравана адпаведнае сацыякультурнае асяроддзе. Прыкладам можа служыць фестываль народнага танца “Беларуская полька”. Ён “атрымаў прапіску” ў г. Чачэрску Гомельскай вобласці, дзе гістарычна развіты жанр народна-побытавага танца. У месцы лакалізацыі народна-інструментальнай творчасці, г. Паставы Віцебскай вобласці, паспяхова праводзіцца фестываль народнай музыкі “Звіняць цымбалы і гармонік”. З 1991 г. ён займае сваю адметную нішу на фестывальнай карце Беларусі. Фестываль народнага гумару ўсталяваўся “ў месцы кампактнага пражывання беларускіх жартаўнікоў” – в. Аўцюкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Відавочнымі сталі ўцягненне ў мастацкую дзейнасць розных нацыянальных і сацыяльных груп насельніцтва, актывізацыя мастацкай дзейнасці грамадска-культурных аб’яднанняў, прыцягненне да рэалізацыі фестывальных праектаў недзяржаўных сродкаў і інш.

Фестывальны рух народнай мастацкай творчасці ў Беларусі – гэта асобая старонка культурнага развіцця нашага народа. Як і любая іншая з’ява культуры, ён выяўляецца ў розных прасторава - часавых вымярэннях, мае сваю гісторыю, тэорыю і практыку. Па вертыкалі яму ўласцівыя якасныя жанрава-відавыя характарыстыкі, па гарызанталі–тэрытарыяльна-колькасныя. Пазначаныя трансфармацыі адлюстроўваюць дынаміку пэўных культурных працэсаў у нашым грамадстве, сацыядынаміку беларускай культуры ў цэлым.

У формах ініцыіравання фестывальнай дзейнасці, пераарыентацыі яе зместу на актуальныя для самазахавання этнічнай культуры праблемы і сцвярджэнні прынцыпу навуковасці ў 90-я гг. XX ст. пачынае адыгрываць індывідуальны фактар. Ініцыятарамі рэспубліканскіх фестывальных мерапрыемстваў выступілі Тадэвуш Стружэцкі (фестывалі народнай музыкі), Мікола Козенка (фестывалі народнага танца), Уладзімір Ліпскі (фестывалі народнага гумару), Валянціна Кірылава (фестывалі студэнцкай творчасці), Ігар Міхна, Дзмітрый Нясцюк (фестывалі сярэдневяковай культуры) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вялікае значэнне для стварэння тэарэтычнага падмурку ў фестывальнай дзейнасці мае далучэнне спецыялістаў з багатым практычным вопытам і ведамі, дзякуючы якім на новым узроўні адбываюцца асэнсаванне і прафесійнае вывучэнне нацыянальных фальклорных традыцый, узнаўленне іх у сучаснай фестывальнай практыцы. У выніку спалучэння тэорыі і практыкі некаторыя фестывальныя ініцыятывы, у прыватнасці фестывалі фальклору, набылі навуковы характар і рэалізуюцца ў форме комплексных доўгатэрміновых праграм [2, с. 4–18; 3, с. 176–185, 285–286].

Адначасова адбываецца працэс удасканальвання тэхналогіі фестывальнай дзейнасці, у многім звязаны з дзейнасцю дзяржаўных устаноў культуры і сістэмы арганізацыйна-метадычнага забеспячэння. Добрым правілам у фестывальнай дзейнасці стала правядзенне навукова-практычных канферэнцый, на якіх сустракаюцца навукоўцы, прадстаўнікі адміністрацыйна-кіраўніцкіх структур, работнікі арганізацыйна-метадычных службаў, майстры, госці фестываляў, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі. Гэта дазваляе усебакова абмеркаваць надзённыя праблемы, прыняць неабходныя меры па падтрымцы і развіцці народнай мастацкай творчасці. Вялікую каштоўнасць для беларускай культуры маюць матэрыяльныя вынікі фестывальнай дзейнасці: буклеты, даведнікі, рэпертуарныя зборнікі, метадычныя дапаможнікі, матэрыялы навукова-практычных канферэнцый, аўдыё і відэаматэрыялы.

Назіранне за цыклічнасцю, зместам і формамі правядзення тых ці іншых фестывальных мерапрыемстваў, аналіз праграм творчых калектываў не толькі выяўляюць мастацка-культурныя прыярытэты ў развіцці жанраў народнага мастацтва, але і спрыяюць аднаўленню практыкі, удасканаленню сістэмы падтрымкі і развіцця народнай мастацкай творчасці ў краіне.

У канцы 90-х гг. XX ст. фестывальная дзейнасць пачала разглядацца ў якасці перспектыўнага напрамку развіцця дзяржаўнай культурнай палітыкі. Роля каардынатара належыць Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь. У гэты час паўстала праблема рэгламентацыі фестывальнай дзейнасці ў краіне. У мэтах упарадкавання практыкі арганізацыі і правядзення фестывальных мерапрыемстваў, выпрацоўкі адзіных сістэмных падыходаў, узгаднення іх з міжнароднымі стандартамі былі распрацаваны і зацверджаны пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 20 лютага 2003 г. “Прыкладныя правілы правядзення фестываляў у Рэспубліцы Беларусь”. У гэтым дакуменце даецца наступнае азначэнне фестывалю: “Ф*естываль* – гэта грамадска - культурная, мастацкая акцыя, якая выражае культурныя інтарэсы сацыяльнай супольнасці, адлюстроўвае ўзровень развіцця відаў і жанраў прафесійнага і аматарскага мастацтва, характарызуецца комплексным вырашэннем эстэтычных, сацыяльных, педагагічных задач”.

Фестывалі адлюстроўваюць багатую і паўнаводную плынь народнай мастацкай творчасці ў Беларусі, наглядна дэманструюць узровень развіцця і асэнсавання той ці іншай мастацкай з’явы. Характэрнымі прыметамі апошняга дзесяцігоддзя ў правядзенні рэспубліканскіх фестывальных акцый сталі іх жанравая дыферэнцыяцыя і спецыялізацыя.

Вакальна-харавое мастацтва з’яўляецца генетычна ўласцівым беларускаму этнасу сродкам эстэтычнага асэнсавання рэчаіснасці. Яно знаходзіць сваё ўвасабленне ў разнастайных мастацкіх імпрэзах. Калі фестываль харавой музыкі “Пеўчае поле” ў Мядзеле адлічвае сваю гісторыю з 1952 г., то рэспубліканскі фестываль-конкурс выканаўцаў беларускай народнай песні “Галасы Радзімы” з 2002 г. Яго арганізатарамі выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў. З 1995 г. пачаў рэгулярна праводзіцца Фестываль праваслаўных песнапенняў, які садзейнічае маральнаму і патрыятычнаму выхаванню беларускіх грамадзян.

На мяжы XX–XXI стст. у Беларусі быў праведзены шэраг фальклорных фестываляў: рэспубліканскія фестывалі беларускага народнага танца “Беларуская полька” (1993, 1994, 1996, 2000), “Палескі карагод” (1991, 2000), “Пярэзвы” (1992), рэгіянальны фестываль аўтэнтычнага фальклору Беларускага Падняпроўя (1996), рэгіянальны фестываль фальклорнага мастацтва “Берагіня” (2000, 2002, 2004). Гэтыя фестывалі служылі мэтам адраджэння і падтрымкі традыцыйных формаў народнай культуры, стымулявалі развіццё аматарскага мастацтва. Іх задача была ў тым, каб даць найбольш поўнае ўяўленне аб сучасным абліччы народнай культуры.

З сярэдзіны 90-х гг. мінулага стагоддзя адраджаюцца ручныя промыслы, якія лічыліся амаль забытымі. Сталі праводзіцца святы ганчарства, салома- пляцення, лозапляцення, ткацтва, кавальства. Яны ладзяцца ў розных куточках краіны. Абласныя і рэспубліканскія акцыі адбываюцца, як правіла, у цэнтрах традыцыйнага развіцця гэтых відаў мастацкіх промыслаў і рамёстваў. У святочна - фестывальную палітру краіны ўпісаліся рэспубліканскае свята ганчарства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Віцебская вобласць), свята саломапляцення і Міжнародны фестываль саламянага мастацтва (г. Мінск і Мінская вобласць), свята кавальства (Брэсцкая вобласць). Правядзенне свят дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мае вялікае мастацка-эстэтычнае і выхаваўчае значэнне, як і святы па адраджэнні, захаванні і развіцці культур нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь.

Важным напрамкам развіцця дзіцячай творчасці ў рэгіёнах з’яўляецца мэтанакіраваная работа з мастацка адоранымі дзецьмі. Яна праводзіцца з мэтамі выяўлення, падтрымкі таленавітых дзяцей, прапаганды іх творчасці, умацавання існуючых калектываў і стварэння новых. Гэта праца ажыццяўляецца праз агляды, конкурсы, фестывалі розных відаў і жанраў мастацкай творчасці. Іх прыкладам з’яўляюцца рэспубліканскія фестывалі “Усе мы родам з дзяцінства”, “Белая Русь”, “Маладыя галасы”, “Песні юнацтва нашых бацькоў”, міжнародныя фестывалі юных талентаў “Зямля пад белымі крыламі”, “Залатая пчолка” і інш.

З 1988 г. адлічвае сваю гісторыю фестываль “Студэнцкая вясна”, які традыцыйна праводзіцца ў г. Віцебску. Ён паслужыў моцным штуршком для развіцця мастацкай творчасці ў вышэйшых навучальных установах краіны.

Шырока вядомымі ў Беларусі сталі фестывалі сярэднявечнай культуры ў Навагрудку (2000, 2002, 2004), “Старадаўні Нясвіж” (2003), “Белы замак” (г. Мінск), рыцарскі турнір “Меч Гедыміна” (г. Мядзел, 2002), рэгіянальныя фестывалі і святы “Заслаўскі набат” у г. Заслаўе, “Лошыцкі фэст” (2000–2004) у г. Мінску. Дачыненне да значных падзей гераічнай гістарычнай мінуўшчыны свайго народа –эфектыўны шлях сацыялізацыі і нацыянальнай ідэнтыфікацыі маладога пакалення.

Фестывальная дзейнасць разглядаецца як адзін з прыярытэтных напрамкаў культурнай палітыкі. Такія рэспубліканскія фестывальныя акцыі, як Дажынкі, Дні беларускага пісьменства і друку, музычныя святы ў Полацку, Заслаўі, Нясвіжы, Міры, Тураве, з’яўляюцца складовай часткай дзяржаўнай праграмы адраджэння малых гарадоў Беларусі [1, с. 10].

Фестывальная дзейнасць разглядаецца ў якасці аднаго са спосабаў жыццядзейнасці народнай мастацкай культуры на мяжы XX–XXI стст. Сістэма свят і фестываляў у розных відах і жанрах мастацкай творчасці з’яўляецца адной з формаў інкультурацыі ў сучаснай сацыякультурнай практыцы народнага мастацтва. Фестывалі мастацкай творчасці выступаюць актыўнай формай захавання і памнажэння культурнага патэнцыялу грамадства, у якой рэалізуюцца творчыя здольнасці людзей. Комплексныя па характары арганізацыйна-тэхнічнага забеспячэння фестывальныя мерапрыемствы практычна рэалізуюць цэлы спектр сацыяльна-культурных функцый, вырашаюць шэраг мастацка-эстэтычных, выхаваўчых, навукова-метадычных, эканамічных і іншых задач. У фестывальнай дзейнасці знаходзяць адэкватнае спалучэнне інтарэсы грамадства і асобы. Гэты від творчай дзейнасці садзейнічае паглыбленню дэмакратычных пераўтварэнняў у грамадстве.

Фестывалі народнай мастацкай творчасці выконваюць функцыю каталізатара мастацка – культурнага працэсу. Яны не толькі адлюстроўваюць ступень развіцця відаў і жанраў мастацкай творчасці, а і садзейнічаюць выяўленню і падтрымцы таленавітых асоб і калектываў, ствараюць спрыяльную атмасферу для іх творчага самавыяўлення, актывізуюць абмен мастацкімі ідэямі, наладжванне творчых кантактаў. Роля фестываляў неацэнная ў развіцці і ўдасканаленні творчага патэнцыялу нацыянальнай культуры, далучэнні насельніцтва да яе лепшых узораў, у актывізацыі міжнароднага культурнага супрацоўніцтва.

1. *Берасцень С.* Залаты век працягваецца // ЛіМ. – 2004. – № 7 (2 ліпеня). – С. 10.

2. *Козенка М.А.* Аб выніках рэалізацыі Рэспубліканскага эксперыменталь-нага праекта “Танцавальны фальклор і дзеці” (2001 – 2003 гг.) // Традыцыйная культура і дзеці. Вып. 1: Рэсп. эксперым. праект “Танцавальны фальклор і дзеці” / Уклад. М.А.Козенка. – Мн.: БелІПК, 2004. – 288 с.

3. *Працяг* будзе... / Уклад. М. А Козенка. – Мн.: БелІПК, 2004. – 316 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ